грамадства, станаўлення асобы, што дазваляе адлюстраваць гісторыю сучаснасці ў адзінстве яе аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, раскрыць духоўнае багацце чалавека.

Твор А.Крэйдзіча прысвечаны жыццю сённяшніх вяскоўцаў, якія не спакусіліся выгодамі і авантурамі гарадскога жыцця, а засталіся працаваць на зямлі — там, дзе нарадзіліся і выраслі. Менавіта тут, у знітаванасці з прыродай, у адвечнай цягавітасці і павазе да працы бачны сапраўдны высакародны чалавек-творца, бачны сапраўдныя людзі. На іх думку, у вёсцы, на зямлі "душы, сэрцу ... зацішна. У горадзе суцэльны скразняк, няма тае ўтульнасці сардэчнай, якую тут адчуваеш, якая дае сілы жыццёвыя".

Выратаваннем сучаснага грамадства ад бездухоўнасці, разбэшчанасці, абыякавасці і жорсткасці, абуджэннем крэатыўнасці народнай і яе дынамічнага развіцця, на думку сучасных публіцыстаў, можа стаць зварот да спрадвечных традыцый, таго ладу жыцця, што прадугледжвае творчасць, культуру існавання на зямлі, здольнасць бачыць і разумець прыгажосць.

**М.Л.Кузьмініч,**
*дацэнт*

## ХАРАВОЕ МАСТАЦТВА Ў МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ МІНСКА (пачатак XX ст.)

У пачатку XX ст. харавое мастацтва займала дамінуючае становішча ў гарадской музычнай культуры Мінска, што тлумачылася традыцыямі быту, высокім узроўнем выкладання спеваў у школах і храмах, наяўнасцю



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таленавітых кіраўнікоў і актыўнай гастрольнай дзейнасцю рускіх, польскіх, украінскіх, яўрэйскіх оперна-тэатральных труп, салістаў, аркестравых і харавых калектываў, якія давалі магчымасць пазнаёміцца з операмі М.Глінкі, А.Даргамыжскага, М.Мусаргскага, П.Чайкоўскага, М.Рымскага-Корсакава, класічнымі творамі заходнееўрапейскіх кампазітараў Дж.Вердзі, Дж.Бізэ і інш.

Канцэрты і спектаклі ішлі на сцэне Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, у залах “Парыж”, “Пасаж”, а таксама ў канцэртна-тэатральных залах Купецкага клуба, Купецкага сходу, Дваранскага дэпутацкага сходу, Грамадскага сходу, у залах шматлікіх гасцініц і навучальных устаноў — вучылішчаў і гімназій.

У канцы XIX—пачатку XX ст. Мінск наведвалі сімфанічныя аркестры і оперна-тэатральныя трупы з Львова, Масквы, Палтавы, Варшавы і Вільні, аркестр рускіх народных інструментаў пад кіраўніцтвам В.Андрэева, лепшыя харавыя калектывы Расіі: капэла Дз.А.Агранёва-Славянскага (1877—1904), хары пад кіраўніцтвам А.П. Карагеоргіевіча (1887), Н.Кальцова (1889), В.Г.Завадскага (1911, 1913), А.А.Архангельскага (1899). У іх выкананні гучалі творы Д.Палестрыны, І.С.Баха, Ф.Мендэльсона, Р.Шумана, Э.Напраўніка, А.Грачанінава, В.Калінікава і іншых кампазітараў, апрацоўкі народных песень, духоўная музыка.

Мінчане мелі магчымасць пазнаёміцца з творчасцю славутых музыкантаў. Сярод іх бас Ф.Шаляпін (1896), кампазітары і піяністы С.В.Рахманінаў (1895, 1913), А.М.Скрабін (1911), тэнар Л.В.Собінаў, салісты Пецярбургскай, Міланскай, Лісабонскай опер, Марыінскага тэатра, скрыпачы П.Сарасатэ, Я.Кубелік, Л.Аўэр, піяністы В.І.Сафонаў, І.Гофман, А.І.Зілоці, Г.М.Есіпава, В.С.Габрыловіч, віяланчэліст А.Вержбіловіч і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Канцэртна-гастрольная дзейнасць прыезджых музыкантаў аказвала значны ўплыў на фарміраванне культурнага асяроддзя беларускіх гарадоў, развіццё музычных густаў, інтарэсаў і патрэбнасцей гарадскога насельніцтва, пашырэнне яго музычнай адукаванасці.

Харавая музыка гучала ў храмах Мінска як элемент культавага абраду. Лепшымі харамі горада лічыліся тыя, з якімі працавалі В.Кашын (Архірэйская царква), Ф.Серыкаў (Прывакзальная царква), І.Краснапеўцаў, М. і Ф.Леўчанкі (царква пры вучылішчы сляпых), Н.Каванько (семінарыя). Гэтыя ж рэгенты кіравалі і аматарскімі калектывамі, разглядаючы іх як школу падрыхтоўкі спевакоў для сваіх царкоўных хароў.

Ф.Серыкаў кіраваў мужчынскім, жаночым і змяшаным харамі прывакзальнага раёна Мінска. У рэпертуары значыліся класічныя партытуры духоўнага і свецкага зместу, у тым ліку творы Г.Гендэля, Р.Вагнера, Дз.Бартнянскага, а таксама песні з рэпертуару “Славянскай капэлы” Дз.Агранёва. М.Пестрыкаў стварыў хары Мінскага музычнага гуртка і Апякунства народной цвярозасці, у канцэртных праграмах якіх значыліся творы А.Рубінштэйна, П.Чайкоўскага, Д.Расіні, К.Вэбера, Э.Напраўніка і інш. Ф.Леўчанка арганізаваў хор аматараў царкоўных спеваў, які выконваў не толькі творы духоўнага зместу, але і сачыненні кіраўніка, народныя песні. З пачаткам першай сусветнай вайны ў 1914 г. ён заснаваў Брацкі хор. М.Леўчанка ўзначальваў саборны хор Апякунства народной цвярозасці. У 1914 г. У.Тэраўскі адзін з першых стварыў беларускі народны хор.

Некаторыя харавыя калектывы горада мелі прафесійны ці паўпрафесійны статус, бо атрымлівалі фінансавыя субсідыі. Напрыклад, саборны хор Апякунства народной цвярозасці атрымліваў субсідыю ад царкоўнага ведамства. Але большасць хароў былі ама-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тарскімі. Яны ствараліся пры буйных фабрыках, заводах, прадпрыемствах, у воінскіх часцях, давалі канцэрты, у рэпертуар якіх уключаліся духоўныя і народна-песенныя творы. Сярод іх кіраўнікоў — вядомыя ў горадзе музыканты. Так, хорам вінна-ачышчальнага склада на Ляхаўцы з 1897 г. кіраваў А.Хамілаў, а потым М.Фядзянаў, хорам паштова-тэлеграфных служачых — Н.Лялюхін, служачых гандлёва-прамысловых устаноў — Л.Эмерман і інш.

Але самым вялікім аўтарытэтам сярод мінскай публікі карысталіся рэгенты царкоўных хароў. Так, Ф.Серыкаў з канца XIX ст. і да 1917 г. кіраваў харамі прывакзальнага раёна Мінска, дзе пераважна жылі чыгуначнікі. У сваім аматарскім калектыве ён выхоўваў папаўненне для царкоўнага хору Чыгуначнай (Прывакзальнай) царквы, у якой служыў рэгентам, выкладаў спевы у царкоўна-прыходскім вучылішчы. Ф.Серыкаў працаваў таксама выкладчыкам рускай мовы ў чыгуначнай школе № 3.

М.Леўчанка — рэгент, настаўнік спеваў у жаночай гімназіі. З 1908 г. ён узначаліў царкоўны хор Апякунства народной цвярозасці, з якім выступаў у канцэртах духоўнай і духоўна-патрыятычнай музыкі, удзельнічаў у царкоўных богаслужэннях. З праграмамі, складзенымі з твораў свецкага зместу, выступаў на дабрачынных і сямейных вечарах, прымаў удзел у юбілейных канцэртах, прысвечаных памяці М.В.Гогаля, А.С.Пушкіна, 50-годдзю адмены прыгоннага права, 100-годдзю Айчыннай вайны 1812 г. і інш.

Ф.Леўчанка, брат М.Леўчанкі, рэгент, настаўнік спеваў у мужчынскай гімназіі, у 1908 г. стварыў хор аматараў царкоўных спеваў, з якім выступаў у Архірэйскай царкве і Духавым манастыры, удзельнічаў у канцэртах рускай песні, дабрачынных і сямейных вечарах Рускага клуба і іншых мерапрыемствах. У 1914 г. заснаваў Брацкі хор, з якім падрыхтаваў некалькі праграм, прысвечаных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычным падзеям, у тым ліку 100-годдзю разгрому Напалеона на р.Бярэзіне.

В.Кашын, рэгент, кіраваў Архірэйскім хорам у 1907—1912 гг., гэты хор выступаў з канцэртамі духоўнай, свецкай і народнай музыкі. Кашын быў таксама выкладчыкам спеваў у духоўных вучылішчах, на курсах для выкладчыкаў спеваў пачатковых школ. Ён знаўца методыкі пастаноўкі голасу ў дзяцей, развіцця навыкаў вакальнага выканаўства.

І.Краснапеўцаў, рэгент, буйны спецыяліст у галіне царкоўных спеваў, выкладчык педагагічных курсаў, быў кіраўніком хору царквы сляпых, выступленні якога карысталася вялікай папулярнасцю ў Мінску. Краснапеўцаў кіраваў таксама аб'яднанымі харамі навучэнцаў розных агульнаадукацыйных устаноў, выступаў разам з імі на літаратурна-музычных ранішніках, мерапрыемствах, прымеркаваных да заканчэння навучальнага года.

У.Тэраўскі (1871—1938) — вядомы беларускі харавы дырыжор, кампазітар і фалькларыст — скончыў Слуцкае духоўнае вучылішча. У 1890-я гг. спяваў у капэле Дз.Аграпёва-Славянскага. З пачатку 1900-х гг. працаваў у Мінску настаўнікам спеваў і рэгентам у пачатковых школах, дзіцячым прытулку для дзяўчынак, узначальваў царкоўны хор Старажоўскай (Пярэспінскай) царквы, аматарскі хор Мінскага таварыства цвярозасці, спяваў у Архірэйскім хоры. У 1914 г. стварыў з навучэнцаў і служачых Мінска беларускі хор, які ў 1917 г. увайшоў у склад Першага беларускага таварыства драмы і камедыі.

Харавыя аматарскія калектывы прымалі ўдзел у царкоўных службах, у дабрачынных і сямейных вечарах, у юбілейных канцэртах. З пачаткам першай сусветнай вайны духоўная тэматыка канцэртаў змянілася, яна стала ў асноўным патрыятычнай. Хары выступалі ў лазарэтах, шпіталях.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прафесійны ўзровень рэгентаў мінскіх харавых калектываў быў даволі высокі. Яны атрымлівалі адукацыю у рэгенцкіх класах Прыдворнай пеўчай капэлы ў Пецярбургу, у Сінадальным вучылішчы ў Маскве, а таксама на рэгенцкіх курсах, якія працавалі ў некаторых расійскіх гарадах, а ў пачатку XX ст. і ў Мінску.

З пачаткам масавай эвакуацыі з Мінска ў 1915 г. дзейнасць харавых калектываў пачала заміраць. Традыцыі харавога выканаўства пачнуць адраджацца толькі ў 1920-я гг. намаганнямі Ф.Леўчанкі, Ф.Серыкава, В.Чарнякоўскага, І.Краснапеўцава, У.Тэраўскага і іншых музыкантаў.

**А.М.Кушнярэвіч,**
*дактарант*

## ПРАВАСЛАЎНАЕ ДОЙЛІДСТВА ЛІТВЫ І ЧОРНАЙ РУСІ Ў XIV ст.

Адной з недастаткова даследаваных праблем з'яўляецца эвалюцыя праваслаўнага дойлідства XIII—XIV стст. на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Галоўная цяжкасць у тым, што помнікі гэтага часу амаль не захаваліся. Яны вядомыя пераважна па летапісных паведамленнях і выніках археалагічных даследаванняў. Безумоўна, на прыкладзе выяўленых падчас раскопак храмаў, якія зараз уяўляюць асобныя фрагменты цэльнага эвалюцыйнага працэсу, нельга прасачыць многія асаблівасці стылявых характарыстык дойлідства XIII—XIV стст., аднак яго ідэйны змест і гісторыка-мастацкія працэсы, якія ў ім працякалі, можна ўявіць дастаткова поўна. Намі зроблена спроба абагуліць і прааналізаваць звесткі, назапашаныя даследчыкамі Беларусі і суседніх краін па азначанай праблеме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ